**З. Канапацкая**

# ТАТАРЫ-МУСУЛЬМАНЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА У XVI – XVII СТАГОДДЗЯХ

Групы татараў-мусульман пасяліліся ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XIV ст. Татары гаспадарчыя, якія атрымалі зямлю і правы баяраў на Літве, фарміравалі атрады коннай кавалерыі, якія напрамую падпарадкоўваліся прыказам князя. У войнах XVI ст. пры неабходнасці гаспадар прызываў усіх здольных татараў у сваім княстве. Татарам гэта давала магчымасць на ўзбагачэнне, заробак і павышэнне ў грамадстве. Зямельныя ўладанні гаспадарчых татараў у XVI-XVII ст.ст. складалі звычайна 5-6 валок, але часцей менш па прычыне таго, што разрасталася сям'я і таксама расла беднасць сярэдняга воіна, бесперапынна адарванага ад гаспадаркі з-за ваеннай службы. Шмат татарскіх сямей перасялялася ў магнацкія маёнткі, ствараючы ўласную ваенізіраваную ахову; вялікая колькасць шукала заробку і прыбытку ў горадзе, гандлі, на транспарце, у абслузе гаспадара-караля і яго слуг.

Шматлікія войны ў XVII ст. прывялі да агульнага збяднення татараў, сканцэнтравання мусульман у гарадах, вялікіх (Вільня, Коўна, Трокі, Мінск) і меншых.[1]

Мусульмане, якія аселі ў Рэчы Паспалітай, найчасцей былі мужчыны, якія тут і стваралі сем'і. Паходзілі яны з розных орд і груп татарскіх, размаўлялі на розных татарскіх дыялектах і мовах, з гэтай прычыны лёгка прымалі мясцовую старабеларускую або старапольскую мову.[2] З XVII ст. літоўскія татары імкнуліся пазбягаць змешаных шлюбаў са славянкамі ці ліцвінкамі. Жылі яны ў згодзе з суседзямі, але захоўвалі сваё веравызнанне, ажэньваліся паміж сабою, сярод мусульман. Гэты факт пацвярджае кніга "Alfurkan tatarski" ("Аль-фуркан татарскі"), выдадзеная ў Вільні ў 1616 г., у якой ідзе размова пра прывоз у ВКЛ жанчын з-пад Волгі, з Вялікага Княства Маскоўскага. Прынцып жаніцьбы мусульман з мусульманкамі прапагандаваў так званы кітаб Мількамановіча (напісаны ў 1781 г.) і кніга Юзэфа Сабалеўскага "Wyklad wiary mahometanskiej" ("Выкладанне магаметанскай веры"), выдадзеная ў Вільні ў 1830 г. Сабалеўскі быў у той жа час суддзёй у павеце Навагруцкім.[3] Права, абавязковае ў ВКЛ, забараняла, аднак, мусульманам звязваць сябе шлюбам з хрысціянкамі, а таксама прымаць удзел у хрысціянскай службе. Працэс пераходу ў хрысціянства меў абмежаваны аб'ём, але працягваўся бесперапынна.

Асіміляцыя татараў рознага паходжання ў польска-літоўскай дзяржаве стала прадметам даследванняў з сацыялагічнага і культурнага пунктаў гледжання.[4] Мусульманскае асяроддзе за час 600-гадовага існавання на землях над Нёманам, Бугам і Дняпром выказала адносна шмат рэлігійнага адпору, прымаючы толькі змены ў культуры і мове. Найбліжэйшыя цэнтры рэлігійнага жыцця, з якімі ўтрымлівалі кантакты польска-літоўскія татары ў XVI і XVII ст.ст., знаходзіліся ў Крымскім ханстве і Турцыі.[5] У XVI ст. існавалі блізкія сувязі з Турцыяй і перыядычна з Іранам, дзе, дзякуючы шматлікім мірным дагаворам паміж польскімі каралямі і турэцкімі султанамі, адбываліся паломніцтвы да Меккі, нясенне вартаўнічай і ваеннай службы польскімі татарамі ў Асманскай імперыі. Гэтымі кантактамі можна тлумачыць пэўны ўплыў суфізму, эстэтычна-містычнага накірунку ў Ісламе, прапагандаванага брацтвам дэрвішы, які прынялі татары ў Літве і Беларусі. У гімнах у хвалу Бога – тэкбірах і зікрах – захаваліся ў ВКЛ мелодыі, якія паходзілі з Крыму.[6] Але час іх асваення цяжка датаваць. З XVI ст. на тэрыторыі польска-літоўскай дзяржавы, на Літве, Беларусі, Падляшшы і Украіне, існавалі пераклады мусульманскіх рэлігійных тэкстаў з арабскай і турэцкай, рэдка з персідскай, на польскую і беларускую мовы.

Ад пачатку XVI ст. у большых месцах засяроджвання татараў сфарміраваліся мусульманскія абшчыны. Імамы (мулы) ведалі Каран, патрэбныя малітвы, арабскае

пісьмо, а таксама ў розных ступенях арабскую і турэцкую мовы.[7] Лепш адукаваныя мулы з'яўляліся на Літве галоўным чынам з Крымскага ханства, нягледзячы на войны і набегі крымскіх татар на Польшчу і ВКЛ. Варшаўскі сейм 1556/1557 гг. і люблінскі сейм 1569 г. далі дазвол на будаўніцтва новых мячэцяў, адукацыю мусульман у краіне.[8] Паводле згадкі езуіта Бальтазара Густавумскага ў 1570 г. татары пабудавалі ў Вільні, на Лукішках мячэць і школу, у якой "вучыліся арабскаму". Уменне карыстацца арабскім пісьмом пачало зніжацца толькі ў канцы XVII ст.[9] у выніку велізарных страт у асяроддзі татарскай эліты, служачай часцей за ўсё ў войску.

Сярод мусульман не было іерархіі ў духавенстве, рэлігійныя абрады выконвалі перыядычна выбраныя прадстаўнікі супольнасці. Мулы кіравалі малітвамі і рэлігійнымі абрадамі. Мулы з'яўляліся адначасова кіраўнікамі мусульманскіх абшчын, вялі метрыкі шлюбаў, нараджэнняў і смерцяў, прымалі клятву ў людзей свайго веравызнання ў судах, альбо таксама іх воінскія прысягі, выконвалі ролю натарыусаў і міравых суддзяў, часам збіральнікаў падушнага падатку з татараў, што не з'яўляліся шляхтай.

Татары-мусульмане былі і заставаліся прававернымі сунітамі, прынялі прынцып, што "брамы ідэнціхаду замкнутыя" ад паловы IX ст., калі памёр апошні з чатырох імамаў Амуд ібн Ханбаль. На практыцы гэта азначала адхіленне ўсіх змен і мадыфікацый ў прынцыпах веры. Гэта палажэнне зрабіла магчымым, наперакор усяму, ня толькі існаванне, але і фарміраванне правільных адносін з навакольным хрысціянствам. Менавіта таму, напэўна, а таксама ў выніку абавязуючых дагавораў з Турцыяй, нягледзячы на жаданне з боку нунцыяў Сталіцы Апостальскай у другой палове XVI ст., каталіцкі касцёл у беларуска-літоўска-польскай дзяржаве не распачынаў місіянерскіх спраў. Нават лепш да гэтага падрыхтаваныя місіянеры, такія як езуіт Каспер Нахай (паходзіў з нагайскіх татараў, атрымаў адукацыю ў Польшчы і Рыме), дзейнічалі ў 1586-1609 гг., галоўным чынам у бязбожным асяроддзі, у пагранічных вайсковых гарнізонах наёмнікаў на паўднёвай Русі Кароннай, т.зв. Украіне. Тэрыторыя Валыні, Падолля і Пакуцця ў той жа час знаходзіліся ў вядзенні адміністрацыі архіепіскапства ў Львове.[10] Абсалютна нейтральнае становішча мусульман у дагматычных і царкоўных спрэчках паміж каталікамі і дэсыдэнтамі надало ім сімпатыю іерархіі каталіцкага касцёла.

Вобраз татараў-мусульман непраўдзіва і крыўдна прадстаўляе пасквіль "Альфуркан татарскі" 1616 г. (узнаўленне 1617 і 1640)[11]. Але ён дазваляе заўважыць таксама і станоўчыя рысы татарскай супольнасц: смеласць, адвагу, гаспадарчасць, шчодрасць, сяброўства, вернасць дадзенаму слову, рэлігійнасць, культывацыю ўласнага звычаю і даволі зладжанае жыццё з хрысціянамі.[12] Асветлены ў літаратуры выпадак знішчэння хрысціянамі мячэці ў Троках у 1609 г. падобны на выкананне разбору будынка, на які не быў атрыманы дазвол біскупа і караля-гаспадара. Звяртаецца ўвага на тое, што выконвалі рашэне суда людзі адкульсці "звонку", не суседзі і не жыхары горада.

Розныя погляды ў справах мусульманскай і хрысціянскай веры часам прыводзілі да спрэчак, у асноўным паміж былымі вызнаўцамі Ісламу, якія прынялі хрысціянства, і ранейшымі іх знаёмымі, якія засталіся пры Ісламе. У жыцці абодвух бакоў, мусульманскага і хрысціянскага, прызнаваўся прынцып талерантнасці і суіснавання ў адносінах да супрацьлеглага боку, калі і ён захоўвае тыя ж самыя прынцыпы Дзесяці запаведзяў, стаўшыя агульнай маральнай плашчаніцай для ўсіх веруючых у Адзінага Бога. Добрае веданне "Старога запавету", перапісанне ў кітабах і хамаілах цэлых евангелічных зваротаў, а, у першую чаргу, павага да Дзевы Марыі і прызнанне прарочай місіі і дзейнасці Іісуса Хрыста згладжвалі антыпатыю і знішчалі варожасць паміж вызнаўцамі Ісламу і хрысціянамі.[13] Безумоўна, мусульманскае апісанне жыцця і смерці Іісуса заставіла важныя тэалагічныя разбежкі з хрысціянствам і адсутнасць: адсутнасць прызнання Ііуса Сынам Божым, які ажыццявіў адкупленне грахоў на крыжы, а таксама дагмат Святой Тройцы.[14]

Даследванні тэкстаў кітабаў татар-мусульман выявілі добрае веданне друкаваных выданняў на польскай мове "свяшчэннага пісання" у перакладзе з лацінскага Сымонам

Будным, асабліва так званай нясвіжскай Біблії, надрукаванай у 1572 г. Ананімныя мусульманскія аўтары ў сваіх тэкстах, напісаных арабскімі літарамі, праводзілі палеміку з хрысціянамі і яўрэямі, карыстаючыся “Старым Запаветам” як паўнапраўнай крыніцай веры рэлігійнай. Ва ўрыўках і разважаннях пераклады Біблії дапаўнялі змест Карана, ствараючы ўласны рэлігійны погляд, арыгінальны, хаця і прававерны мусульманскі. Пісцы-мусульмане выкарыстоўвалі рэфармацыйную літаратуру на карысць знешняй дыскусіі, каб даць адказ на патрабаванні хрысціян. Быў умела скрытыкаваны польскі пераклад “Святога пісання”, зробленага ксяндзом Якубам Вуйкам. У “Вывадзе нашага народу” у канцы XVI ст. таксама былі ліквідаваны жарты Яна Каханоўскага, выкрываючыя яго памылкі і няведанні. Падвергся крытыцы і цэлібат каталіцкіх ксяндзоў, але выказывалася павага да папства як “дастойных хвалы”.[15] Вялікая колькасць твораў, змешчаных у кнігах татараў, аб’ядноўвала святыя хрысціянскія і мусульманскія тэксты, нават Евангелле, захоўваючы ўласную рэлігійную дактрыну, па якой прарок Іса (Іісус Хрыстос) быў выратаваны ад укрыжавання Архангелам Гаўрыілам. Прымаліся словы, вызначэнні, польская форма біблейскіх імёнаў. Мусульманскія аўтары ў ВКЛ дэманстравалі добрую начытанасць і шляхецка-сялянскую ментальнасць. Элементы этыкі і традыцыі некаторыя даследчыкі літаратуры называюць “мусульманскім сарматызмам”.

У літаратуры пераважае погляд, што менавіта вызнаваная рэлігія на працягу доўгіх стагоддзяў перашкаджала татарам-мусульманам атрымаць пэўныя палітычныя правы, права ўдзелу ў сеймах і займання пасад. Рашэнні сейму 1768 г., Канстытуцыя 1 мая 1791 г., а таксама Кодакс Напалеона ў Варшаўскім княстве ліквідавалі астатнія перашкоды ў авалоданні татарамі палітычных правоў у польска-літоўскай дзяржаве.[16]

## *Литература*


1. Я.Гембіцкі. Да пытання аб сацыяльна-эканамічным стане беларускіх татар у сярэднявеччы // Запіскі аддзела гуманітарных навук. Беларуская АН. Кн. 8, Минск, 1929, с.55-69; P.Borawski, W.Sienkiewicz, T.Wasilewski. Rewizja dóbr tatarskich 1631 r., summariusz i wypisy, Acta Baltico-Slavica, t.20, 1989, s.80 i nn.; A.B.Zakrzewski. Zamożność Tatarów w Wielkim Księstwie Litewskim: XVI-XVIII w., Prace Naukowe WSP w Częstochowie, Zeszyty Historyczne, z.V, 1998, s.5-10.

2. Cz.Łapicz. Kitab Tatarów litewsko-polskichywloruń 1986, s.26-60, A.Zakrzewski. O asymilacji Tatarów w Rzeczypospolitej w XVI-XVIII w., Tryumfy i porażki, Warszawa, 1989, s.76-96.

3. Cz.Łapicz. Tradycje religijne muzułmanów litewsko-piskich, Wilno-Wileńszczyzna jako krajobraz i środowisko wielu kultur, t.I, Białystok 1992, s.306-7; J. z Konkirantów Sobolewski, Wykład wiary mahometanskiej...,Wilno 1830, s.88.

4. Гл. працы: А. Грыцкевіча, І. Канапацкага, С. Думіна ды іншых гісторыкаў.

5. Ł.Kryczyriski. Tatarzy polscy a Wschód muzułmasski, Rocznik Tatarski, t.II, 1935, s.57-113. С.Думин. Татарские царевичи в Великом Княжестве Литовском (XV-XVI вв.), Древние союзы и государства на территории СССР, Материалы и исследования, 1987 г., Москва 1989, с.107-113.

6. S.Chazbijewicz. Wpływ sufizmu (tasawwuf) na zwyczaje muzułmanów w Polsce, Życie Muzułmańskie, R.II, 1988, Nr,9, s. 30-55.

7. Kryczynski S. Tatarzy litewscy. Warszawa, 1938.

8. B.Kopański. Kwestia turecka w sejmach polskich i pismach ulotnych XVI w., Przegląd Orientalistyczny, 1977, Nr.l (107), s. 38 i 41.

9. A.B.Zakrzewski. O asymilacji Tatarów, s. 90-96.

10. Biblioteka Czartoryskich, rękopis 1266, f.9-10; W.Sobieski. Jezuita Tatarzyn, Trybun ludu szlacheckiego, Warszawa 1978, s. 322-327.

11. Мухлинский А. Исследование о происхождении и состоянии литовских татар. СПб., 1857.

12. Piotr Ozyżewski. Alfurkan tatarski prawdziwy na 40 części podzielony, Wilno 1616, Biblioteka Uniwersytetu Warszawskiego Dział Starodruków; por, - J.Tyszkiewicz. Tatarzy na Litwie i w Polsce.Studia z dziejów XIII-XVIII w.. Warszawa 1989, s. 289-295.

13. Cz.Łapicz. Tradycje religijne, s.311-316; J.Tyszkiewicz. Z historii Tatarów polskich: 1794-1944, Pułtusk 1998, s. 59-72.

14. J.Homerski. Jezus w nauce Koranu, Zeszyty Naukowe KUL, t.VII, 1964, Nr.3, s. 15-23.

15. B.Majewska. Borzuj, Diiaram, Jan z Czarnolasu i kaznodzieja tatarski, Pamiętnik Literacki, 1987, Nr.2, s.227-228.

16. A.Drozd. Wpływy chrześcijańskie na literaturę Tatarów w dawnej Rzeczypospolitej, Pamiętnik Literacki, 1997, Nr,3, s.9-34. S.W.Dumin. Szlachta tatarska w Wielkim Księstwie Litewskim i zmiany w jej sytuacji prawnej w XVI-XVIII w., Roczniki Historyczne, t.57, 1991, s.l47-163;  A.Drozd. Opinia senatora Rzewuskiego w sprawie prerogatyw wyborczych dla tatarów z 1819 roku, Rocznik Tatarów Polskich, t.VI, 2000, s. 36-47.